ВОПРОСЫ ИСТОРИИ

***А.А. Арцішэўскі***

# УСПАМИНЫ ПРА НАСТАУНІКА, АСОБУ, ЧАЛАВЕКА, ТАЛЕНАВІТАГА ВУЧОНАГА

*Белорусский государственный медицинский университет,*
*г.Минск, Республика Беларусь*

*Рассмотрены некоторые аспекты биографии и научной деятельности бывшего заведующего кафедрой гистологии, цитологии и эмбриологии Станчо Миленковича Миленкова по воспоминаниям его ученика нынешнего профессора кафедры А.А.Артишевского*

**Першая сустрэча.**

– “Што Вас да мяне прывяло?”- спытаў прафесар Станча Міленкавіч Мілянкоў, калі ў канцы верасня 1960 года я пераступіў парог яго кабінета. Ладна скроены, з лёгкай сивізною на скронях, ён дапытліва пазіраў на мяне. Што яму адказаць? Што ўсё жыццё марыў стаць гістолагам і прыйшоў прасіцца ў аспірантуру? Гэта - хлусня! Усё свядомае жыццё я марыў лячыць людзей. Свае студэнцкія гады сумясціў з працай медбратам у трэцяй клінічнай бальніцы, вывучаў клінічныя дысцыпліны не як большасць – дзеля адзнакі, а каб умець дапамагчы хвораму…

Праз два гады пасля сканчэння інстытута здаў іспыты на пяцёркі па ўсіх прадметах і рашэннем Савета інстытута мяне залічылі аспірантам ЛОР кафедры. І раптам, як гром сярод вяснавога неба прагучала паведамленне: калегія Мінздрава рашэнне Савета інстытута адмяніла! Ніхто не тлумачыць, чаму. Іду да міністра І.А. Інсарава. Ён мяне ведаў: некалькі разоў давялося выконваць яго асабістыя даручэнні, звязаныя з кадравымі пытаннямі. Прыняў адразу.

– “Іван Анісімавіч, я сумленна працаваў два гады, здаў на пяцёркі іспыты і не разумею, чаму мяне не прынялі ў аспірантуру?”– пачаў я з парога. Міністр выйшаў з-за стала, усадзіў у крэсла мяне, сеў насупраць і, не адказваючы на маё

пытанне, пачаў раіць паехаць вучыцца ў спецаспірантуру ў Маскву па арганізацыі аховы здароўя.

– "Я чуў, што ў цябе добра атрымліваецца работа з людзьмі, вось і станавіся арганізатарам".

–"Але я хачу быць урачом. Усе гады вучобы ў інстытуце працаваў у клініцы". Міністр уздыхнуў, закурыў.

–"На калегіі выступіў начальнік планава-фінансавага ўпраўлення Дарасінскі, які лічыць, што цябе нельга прымаць у аспірантуру, таму што ў інстытуце на кафедры акушэрства працуе бацька тваёй жонкі, узнікае сямейственнасць, і калегія з ім пагадзілася".

–"Але ж я паступіў на іншую кафедру". Міністр маўчаў, даючы зразумець, што аудыенцыя скончана.

– "Іван Анісімавіч, а Мінздраў можа даць мне даведку аб тым, што я не прыняты ў аспірантуру з-за сямейственнасці?"

– "Навошта?"-зацягваючыся, спытаў міністр.

– " Калі савецкай уладзе перашкаджае мая сям'я, то я падам на развод!"

Эх, нястрыманасць юначая! Колькі разоў я шкадаваў аб гэтых словах пасля. Міністр прыўзняўся, націснуў на кнопку, выклікаючы памочніка і коратка кінуў: – "Вон!" Першае жаданне пайсці ў ЦК, Саўмін, звярнуцца ў суд, змянілася другім: з'ехаць далей ад Мінска, дзе прынята бязглуздае па сутнасці і абразлівае для мяне і бацькі маёй жонкі рашэнне. Што гэта? Звядзенне рахункаў з бацькам жонкі, сумленным чалавекам, інвалідам вайны?

…Размова з прафесарам доўжылася з гадзіну. У канцы яе прафесар сказаў: – "Я запытаюся ў рэктара, ці можна вас прыняць. Калі ён і міністэрства не супраць, то вазьму аспірантам да сябе. Але памятайце, гісталогія любіць працавітых. Умееце працаваць – праз тыдзень прыходзьце на іспыты.".

Без фундаментальнай падрыхтоўкі, перагартаўшы падручнік, па якому вучыўся шэсць гадоў назад, я прыйшоў здаваць гісталогію. Выцягнуў білет для студэнцкіх іспытаў. Экзаменатары – прафесар Мілянкоў і дацэнт Красоўскі, трэці, здаецца, дацэнт Краўцоў, адсутнічаў. Ніякіх пытанняў, як гэта прынята на кафедрах ў апошнія гадоў пяцьдзесят, ніхто мне не даваў. Забягаючы наперад хачу зазначыць, што за ўвесь час маёй працы пры Мілянкове я не бачыў, каб і ён гэта рабіў. Гульню ў іспыты, як і наогул паказуху ён не прызнаваў. Па білету адказаў, і калі мне здалося, што ўсё скончылася, дацэнт запытаў:– "Што такое паўлунні Джыануццы?" Я адказаць не змог і атрымаў чацьвёрку. Паколькі на кафедры быў некамплект выкладчыкаў, два гады запар сюды ніхто не ішоў у аспірантуру, то мяне залічылі з чацвёркай па профільнай дысцыпліне. І вось з 15 кастрычніка 1960 года я аспірант кафедры…

Як імкліва праносіцца час! Здаецца нядаўна гэта было, а ўжо праляцелі дзесяцігоддзі, прамільгнула жыццё цэлага пакалення. На новы ўзровень паднялася гісталогія… Але галоўным рухавіком і ў навуцы, і ў педагагічнай творчасці па ранейшаму застаецца самаахвярнасць у працы і апантанасць, здольнасць разгледзець новае і перспектыўнае. Менавіта такія рысы былі вызначальнымі ў характары прафесара С.М. Мілянкова, а яшчэ святая вера ў ідэалы камунізма, дэмакратызм і адкрытасць у адносінах з падначаленымі. Развіваць такія якасці ён імкнуўся і ў сваіх падначаленых, асабліва аспірантаў.

**Школа працавітасці і цярпення.**

У першы дзень майго аспіранцтва, паказваючы на канапу, што стаяла ў асістэнцкім пакоі, прафесар казаў: – "Калі папрацуеш 16-20 гадзін – захочацца адпачыць, а то і заначаваць", а потым дадаў: – "Дысертанту трэба мець на кафедры запас ежы, не дрэнна было б прыдбаць мяшэчак бульбы". Гэтыя дзівацтвы я ўспрыймаў з гумарам, але хутка рэчаіснасць усё расставіла па сваіх месцах. Для аспірантаў ён устанавіў правіла: працаваць да той пары, пакуль працуе сам. С.М.

Мілянкоў пакідаў кафедру не раней 22-24 гадзін. Ён, член рэдкалегій саюзнага і рэспубліканскага журналаў, эксперт ВАК, не толькі пісаў артыкулы, рэцэнзіі, раздзелы кніжак, дапамагаў дысертантам, а шмат часу аддаваў удасканаленню методык афарбоўкі тканак, сам займаўся афарбоўкай прэпаратаў. Перакананы, што ў гэтай справе яму не было роўных у Саюзе. Ён ведаў, як і ад якой жывёліны лепш узяць орган для прыгатавання вучэбных прэпаратаў, якім чынам яго апрацаваць. Яго патрабавальнасць да якасці прэпарата, непрыймальнасць да неахайнасці ў іх прыгатаванні былі агульнавядомы. Дасведчанасць у гэтых пытаннях грунтавалася на глыбокай тэорыі і практыцы. Прафесар прайшоў добрую школу ў якасці прэпаратара пад кіраўніцтвам знакамітага прафесара М.Е. Шляхціна, які ў трыццатых гадах выдаў цікавы падручнік па арганалогіі. На кафедры шэф усталяваў правіла: аспіранты павінны авалодаць майстэрствам прыгатавання вучэбных прэпаратаў. Не пазнаёміцца з тэхналогіяй, не прыняць удзел у прыгатаванні прэпарата, седзячы побач з лабарантам, а авалодаць майстэрствам і прыгатаваць прэпараты для вучэбнага працэса. Гэта, улічваючы аспіранцкі дэфіцыт часу, было жорсткае патрабаванне. Мая спроба перакласці працу на лабаранта была выкрыта і лабараторыя атрымала загад: “на аспіранта не працаваць!” Але калі аспірант, праяўляючы старанне і кемлівасць выконваў загад і пасля дэталёвага шэфавага кантролю студэнты атрымлівалі дэфіцытны прэпарат, задавальненне Станча Міленкавіча біла праз край. Памятаю, што мой першы поспех - удалае прыгатаванне прэпарата “апарат Гольджы” ён вельмі рэкламаваў сярод выкладчыкаў і студэнтаў інстытута… Хутка я зразумеў, што авалоданне агульнагісталагічнымі методыкамі - гэта толькі першы крок.

**Для аспіранта няма немагчымага.**

Убачыўшы, што звычайныя прэпараты атрымліваюцца не блага, Станча Міленкавіч паклікаў у кабінет і выклаў: – “Сёння для гістолага звычайных метадаў недастаткова. Неабходна выходзіць на новыя рубяжы, а гэта, у першую чаргу,

гістахімія. Ёю і займіся!” Гэта азначала: круціся як хочаш, але вынікі даследванняў павінны грунтавацца на гістахімічных методыках. І пачалося…

У рэспубліцы ў той час нічога ў гэтым плане не рабілася. Абышоўшы мінскія лабараторыі, мы зразумелі: тут гістахіміяй “не хварэюць”. Неабходна арыентавацца на Маскву. Пачаў збіраць пропісі методык, запасаць рэактывы. Шэф не ведаў гістахіміі, таму “дырэктывы” нярэдка канчаліся словамі: “на што назбіраем рэактываў, тое і будзем выяўляць, у гістахіміі ўсё новае”. Праўда, ён вельмі актыўна выконваў любыя просьбы па здабыванню дэфіцытных хімікатаў і фарбавальнікаў. Наведваючы маскоўскія лабараторыі і кафедры, а потым і замежныя, заўсёды вяртаўся не з пустымі рукамі.

**Шэфавы падарункі.**

З замежнай паездкі шэфа чакалі… І вось ён з’явіўся на кафедру памаладзелы, вясёлы, яшчэ больш загарэлы і падцягнуты з дзвюма вялізнымі пакункамі ў руках. Зайшоў у лабараторыю. Лабаранткі абкружылі яго, як мухі. Традыцыйныя пытанні пра паездку, надвор’е, умовы пражывання, цэны на прадукты і тавары, зарплату, здавалася не скончацца. Па меры таго, як ён расказваў пра жыццё ў Балгарыі, пра крамы і рэстараны позіркі слухачоў усё часцей затрымліваліся на прынесеных ім вялікіх пакунках. У той час усе, хто трапляў за мяжу, імкнуліся прывезці адзенне, ці абутак, іншы дэфіцыт. Перахапіўшы позірк некага з лабарантаў, Станча Міленкавіч казаў: – “Гэта мае падарункі аспірантам”,- павярнуўся да нас з Андрэем Васільевічам, – “Вазьміце гэтыя рэчы і занясіце ў мой кабінет”. Мы ўзялі па клунку і пайшлі за шэфам. Там ён распакаваў адзін. У ім аказалася вельмі шмат пакецікаў і бутэлечак з самымі рознымі рэактывамі.

– “Гэты чысты фуксін, светлавы зялёны і канадскі бальзам мне даў акадэмік Хаджыолаў, а вось гэта я атрымаў ад ветэрынарнай акадэміі”- паказваў ён наступны скрутак…

– “Андрэй, усё перапішы, зрабі этыкеткі на рускай мове, а то пакрадуць”- загадаў ён. Загад нас не здзівіў, бо рэактывы былі дэфіцытам і шэф шмат разоў казаў, што вакол кафедры часам спрабуюць “паляваць” суседзі.

–“А Вы паездзілі па Балгарыі?”- спытаў я.

–“Мала, у асноўным наведаў навуковыя ўстановы гісталагічнага профілю, Міністэрства аховы здароўя і акадэмію”. Я пазіраў на шэфа з доляй расчаравання: людзі прывозяць з-за мяжы каштоўныя рэчы, трацяць час і грошы на цікавыя вандроўкі, а ён, трапіўшы за мяжу, на сваю Радзіму, недасягальную для нас краіну, амаль палову водпуску патраціў на пошук і выпрошванне фарбавальнікаў і рэактываў!

– “А на славутых залатых пясках Вы пабывалі?”

– “Так, тыдзень правёў у пляменніка ў Варне. Адзін раз быў у рэстаране. Дорага гэта, не па нашых грошах” – адказаў ён. Потым узяў у рукі другі пакунак і сказаў: – “У Сафіі праходзіла навуковая канферэнцыя, я ў ёй удзельнічаў і прывёз матэрыялы. Там пазнаёміўся з Югаслаўскім акадэмікам Мілкавічам. На кніжнай выставе ўбачыў амерыканскі падручнік па гісталогіі Блюма і Фаусета. Падручнік вельмі спадабаўся, але надта дарагі, каштуе 42 долары. У мяне такіх грошай не было, але югаславы яго купілі ў выглядзе платы за савецкую медыцынскую і гісталагічную літаратуру коштам на 40-50 рублёў. Вось ты і арганізуй пакупку і адпраўку такой літаратуры” – даручыў ён мне.

Нам з А.В.Пішчынскім давялося набыць і адасланць у Югаславію тры пасылкі з кнігамі, каб разлічыцца за адзін падручнік. Станча Міленкавіч і мы шмат разоў распавядалі студэнтам пра гэта, падкрэсліваючы, што савецкая дзяржава выдае танную літаратуру, каб просты народ меў доступ да інфармацыі, стварае неабходныя ўмовы для атрымання вышэйшай адукацыі. У той час мы амаль не задумваліся над тым, чаму ў несацыялістычных краінах дзяржава не стварае для народа танных падручнікаў, але простыя людзі атрымліваюць добрую адукацыю.

Шэф расказаў, што на канферэнцыі сустрэў вельмі адукаваных і дасведчаных людзей, сярод іх шмат маладых.

Мы бачылі, што амерыканскі падручнік мае пэўныя перавагі над савецкім, але не хацелі пагадзіцца з гэтым. Слухаючы шэфа, не хацелі верыць, што за мяжой выкладчыкі і навукоўцы забяспечаны значна лепш матэрыяльна, маюць лепшыя ўмовы для працы і адпачынку. Ён і сам пасля паездкі за мяжу многае цяжка і балюча пераасэнсоўваў. Мабыць не толькі з нашых, але і з яго вачэй паступова спадаў “жалезны занавес”.

**Аспірант не курыца**

У шэфа была яшчэ адна якасць: ён лічыў неабходным рэгулярна вывозіць сваіх аспірантаў на навуковыя канферэнцыі і сімпозіумы ў Маскву, Ленінград і іншыя цэнтры.

– “Аспірант не курыца ва ўласным саку, з яго добрай стравы не атрымаеш” – паўтараў ён. Зразумела камандыроўку ніхто аспіранту не аплочваў, і паездку прыходзілася рабіць за свой кошт. Калі ўлічыць, што ў мяне ўжо быў двухгадовы сын, а жонка працавала лабарантам, такія траты былі даволі адчувальнымі. Але пад шэфавым націскам ужо на першым годзе аспірантуры я адправіўся ў Маскву (праходзіла канферэнцыя ў Інстытуце Мозгу). Цэлы дзень мы з аспірантам з АН БССР Г. Краскоўскім пратлуміліся, каб уладкавацца з жытлом. Прымалі толькі ўдзельнікаў форума, а ў мяне ніякай паперкі не было і прышлося туга. Увечары нас пусцілі у прысенне гатэлю “Якар” пераначаваць, седзячы ў крэслах. Назаўтра ў Інстытуце Мозгу шэф усадзіў нас побач з сабою і расказваў пра дакладчыкаў канферэнцыі . Я ўпершыню бачыў П.К. Анохіна, В.В. Партугалава, В.Г. Елісеева, А.Г. Кноррэ, Л.С. Сутулава і іншых зорак савецкай навукі.

У перапынку, калі да Мілянкова падыходзілі знакамітыя прафесары і акадэмікі, Станча Міленкавіч, прадстаўляючы мяне, аспіранта, казаў: “Ён вельмі ўдала выяўляе апарат Гольджы ў клетках спінальнага гангліяˮ. Усе ўглядаліся ў мае вочы,

а я пачаў думаць, што, мабыць, гэты ганглій і апарат Гольджы будуць пачаткам маёй працы над дысертацыяй.

У плане навуковай інфармацыі з той канферэнцыі у памяці амаль нічога не засталося. Мабыць таму, што большасць паведамленняў лягла на непадрыхтаваную глебу і не выклікала якіх-небудзь асацыяцый. А вось адно з пазапраграмных мерапрыемстваў засталося ў памяці на ўсё жыццё. Па прапанове прафесара Партугалава мы са Станчам Міленкавічам паехалі на лекцыю амерыканскага прафесара Унгара, якую ён чытаў у Маскоўскім Універсітэце. На лекцыі былі прадстаўлены вынікі, атрыманыя прафесарам у эксперыментах з планарыямі. Было паказана, што шляхам паўторных уздзеянняў у планарый можна выклікаць станоўчы рэфлекс, па якому яны ўстойліва адрозніваюцца ад кантрольных. Але калі "навучаных" істот раструшчыць, а гамагенатам карміць кантрольных, то і яны становяцца падобнымі на "навучаных". З гэтага паведамлення вынікала, што ў аснове памяці ляжыць матэрыяльны субстрат, які можа перадавацца. Гэта паведамленне нікога не пакінула абыякавым, выклікала ажыўленыя каментарыі. І калі значна пазней я чытаў пра вучаніцу Унгара, таксама прафесара, якая ўзначаліла лабараторыю пасля яго смерці, прадоўжыла і яшчэ больш праславіла гэтую ўстанову знаходкамі па стымуляванню памяці, то заўсёды ўспамінаў тую сустрэчу са знакамітым навукоўцам.

**Навуковыя варункі**

Прыкідка тэмы дысертацыі пачалася ў канцы першага года навучання. Усе меркавалі, што гэта будзе традыцыйнае для кафедры вывучэнне інервацыі якога-небудзь органа. Але даручаць мне выкананне дысертацыі на нейрагісталагічную тэму шэф не захацеў: – "Тут і так цесна, некаторыя анатамы да гэтага часу не даравалі мне, што не яны, а я зрабіў праграмны даклад на саюзным з'ездзе ў Кіеве". Так, адгалоскі пра гэты даклад даходзілі і да мяне, хоць ён адбыўся за два гады да майго паступлення ў аспірантуру. Выказваліся меркаванні, што не прафесар

Мілянкоў, а анатамы мелі больш падстаў, каб зрабіць такі даклад. На самой справе, яны напрацавалі больш фактаў, але прафесар С.М. Мілянкоў не проста канстатаваў знаходкі, а больш грунтоўна прааналізаваў іх і знчна глыбей разабраўся ў сутнасці назіраемых фактаў, па-сутнасці, стварыў морфафункцыйны падыход у нейрагісталогіі. Чаму так адбылося?

Мы, яго вучні, разумелі, што гэта не выпадкова. Так, прафесар Мілянкоў не атрымаў у юнацтве добрай базавай адукацыі, гэта праўда. Рабфак і медфакультэт Сярэднеазіяцкага Універсітэта, які ён, хлопец-агароднік скончыў, зразумела ж не Маскоўскі, ці Пецярбургскі інстытут. Але ад прыроды гэта быў кемлівы і творчы чалавек, які ніколі не пераставаў вучыцца. Ён вучыўся у прафесара М. Е. Шляхціна, у інтэлігентнай Вольгі Сяргееўны- яго жонкі, у кожнага чалавека, з якім зводзіў яго лёс. Значны станоўчы ўплыў на яго светапогляды, на здольнасць па новаму глядзець на ўжо вядомыя факты зрабіў яго сябра член-карэспандэнт АН БССР прафесар А.Ю. Бранавіцкі, патафізіёлаг па спецыяльнасці. Гістарычная ісціна заключаецца ў тым, што ніхто іншы, а ён, прафесар С.М. Мілянкоў, сфармуляваў асноўныя палажэнні кампенсаторна-прыстасавальных рэакцый перыферычнай нервовай сістэмы – самай прыарытэтнай вобласці навуковых пошукаў савецкіх гістолагаў!

**Новы навуковы напрамак**

Сёння многія з тых, хто ведаў прафесара прызнаюць, што С.М.Мілянкоў дзіўным чынам умеў угледзець новае, перспектыўнае ў навуцы. Гэта тычыцца як метадаў, так і накірункаў даследвання. Ён адзін з першых у саюзе ўбачыў неабходнасць шырокага выкарыстання гістахіміі і электроннай мікраскапіі ў даследваннях працэсаў развіцця арганізма. Памянёныя метады дазвалялі глыбей пранікнуць у тайны морфагенеза. У біялогіі і медыцыне ў гэты час сталі моднымі тэрміны “стрэс”, “адаптацыя”, на слыху было імя нобелеўскага лаўрэата Ганса Селье.

Вось адкуль у шэфа з’явілася ідэя з дапамогай передавых метадаў заняцца вывучэннем працэса развіцця наднырачнікаў – органа адаптацыі.

– “Будзем вывучаць ні ў пацука, ці труса, а ў чалавека” –вырашыў шэф. Гэта ўскладняла задачу, рабіла працу ў значнай ступені пошукавай. –“Вось і шукай!” – сказаў мне Станча Міленкавіч. Так пачаўся новы этап не толькі ў маім, але і ў яго навуковым жыцці, а кафедра набыла новы накірунак навуковых даследванняў.

У 1961 годзе ў аспірантуру прыйшоў А.В. Пішчынскі, і Станча Міленкавіч адразу прапанаваў яму тэму дысертацыі – вывучаць працэсы развіцця падстраўнікавай залозы. Зразумела ж не ў пацука, а ў чалавека. Андрэй адразу ўключыўся ў навуковую працу, а ў мяне, як кажуць, тут і конь не валяўся, хоць і пачынаўся другі год аспірантуры. Трэба было інтэнсіўна працаваць, але ні абсталявання, ні рэактываў, ні вопыту на кафедры не было. Тут гэтым ніхто не займаўся. Ды і шэф, пасля маёй вясенняй паездкі ў Маскву пазіраў на мяне з прахалодай**.**

**Паміж намі прабегла кошка**

Справа вось у чым.

У сакавіку 1961 года шэф паслаў мяне на кафедру гісталогіі Першага Маскоўскага мэдінстытута. Заданне традыцыйнае для аспіранта: пераняць патрэбныя методыкі, сабраць літаратуру па тэме дысертацыі. На кафедры сустрэлі мяне абыякава Заг.кафедрай прафесар В.Г. Елісееў у той час сярод гістолагаў Савецкага Саюза быў асобай нумар адзін, і да іх кожны дзень нехта прыязджаў, альбо прыходзіў з усіх канцоў краіны. Кафедра займалася вывучэннем тканак унутранага асяроддзя і калі я паведаміў, што мне прапанавана вывучаць развіццё наднырачнікў у чалавека, В.Г. Елісееў прапанаваў азнаёміцца з методыкай выяўлення аскарбінавай кіслі, якую ў іх вывучала Н.В. Міліцына. Але аказалася,што дысертацыя ўжо абаронена, жывёл і рэактываў не засталося. Пачаў збіраць патрэбную літаратуру і хутка зразумеў: карысную для мяне інфармацыю

можна атрымаць хіба што ў інстытуце Біялогіі Развіцця, дзе начале з прафесарам М.С. Міцкевічам група наукоўцаў працуе над вывучэннем станаўлення эндакрыннай сістэмы ў зародкаў жывёл. На маю просьбу дапамагчы мне ўсталяваць кантакт з гэтым інстытутам В.Г. Елісееў прапанаваў увогуле перайсці ў аспірантуру да яго і заняцца іншай тэмай. Гэта адбылося пасля таго, як я праводзіў яго ад кафедры да станцыі метро Кіраўская. –“ Але ж я ўжо залічаны аспірантам Мінскага інстытута” –“Не бяда, заўтра саюзны міністр аддасць загад аб пераводзе на кафедру гісталогіі Першага Маскоўскага медінстытута. –“А як жа быць са Станчам Міленкавічам?” –“Ты яму патэлефануй і перадай аб маёй прапанове”. Нечаканая прапанова мяне ўсхвалявала. Я ведаў, што В.Г. Елісееў збірае каманду для выканання даследчай працы дзяржаўнага ўзроўню. Значна пазней даведаўся, што гэта была “касмічная тэма”. Птэлефанаваў Мілянкову. Ён сустрэў прапанову свайго сябра Елісеева рэзка адмоўна, прыказаў вяртацца ў Мінск, не даўшы дагаварыць кінуў трубку…

**Свет не без добрых людзей**

Раніцой наступнага дня паведаміўшы Елісееву пра тое, што мая сям’я супраць майго перавода ў Маскву, зайшоў у Інстытут Біялогіі Развіцця. Атрымаў аудыенцыю нават у дырэктара М.С. Міцкевіча. Расказаў пра свае планы і сустрэў не толькі спачуванне, але і падтрымку. Ён пазнаёміў мяне з С.Е. Левінай, якая ўжо заканчвала доктарскую дысертацыю, Е.Б. Скебельскай, В.І. Алтуховай завяршаўшых выкананне кандыдацкіх дысертацый. М.С. Міцкевіч, выхадзец з Мінску і яго падначаленыя падзяліліся са мной не толькі сваім вопытам, але і рэактывамі для гістахімічных даследванняў. Я удзячны гэтым людзям па сёнешні дзень. Знешняя абыякавасць шэфа да мяне стымулявала маю актыўнасць. За год скончыў збіранне і вывучэнне матэрыялу. Мая актыўнасць шэфу падабалася, хоць ён і вытрымліваў характар. Гэты чалавек адкрыта выказваў тое, што было ў яго на душы. Пасля чарговай паездкі ў Маскву, калі, мабыць, ён пагутарыў з

В.Г.Елісеевым і зразумеў, што ніякай "здрады" з майго боку не было, нашы адносіны зноў сталі даверлівымі.

**Нефармальныя адносіны**

Неяк вясной, калі пачала прабівацца трава каля анатамічнага корпуса на Ленінградскай вуліцы, шэф з жалем сказаў: – "Шкада, што тут не расце крапіва".

–"А навоштта яна, карміць пацукоў вітамінамі?" – спытаў Андрэй. (У нас была праблема з атрыманнем ад іх прыплоду).

– "Я і сам бы з задавальненнем паеў салаты з крапівы"- адказаў ён. Вечарам, гуляючы са сваім трохгадовым сынам на Беларускай вуліцы, я нагледзхеў добрыя плантацыі гэтай расліны на ўзбярэжжы Свіслачы і расказаў аб іх шэфу. У той жа дзень прачытаўшы лекцыю, ён узяў ладны нож, авоську і мы адправіліся да ракі. Згінацца яму было трошкі цяжкавата, але ён спачатку паказаў, як трэба зрэзаць крапіву, а потым аддаў нож і хадзіў следам,назіраючы, як я напаўняю авоську. – "Мы, балгары, не можам жыць безі зеляніны",- быццам апраўдваўся ён. А назаўтра з натхненнем расказваў на кафедры, як смачна павячэраў і паснедаў, выкарыстаўшы сабраную зеляніну.

Хоць прафесар Мілянкоў і прайшоў нялёгкі шлях "з нізоў" у некаторых (умоўна называемых пабытовымі) пытаннях ён быў вельмі недасведчаны. У адзін з вечароў, праводзячы фіксацыю матэрыялу па новай тэматыцы пад ціскам праз аорту, мы пацярпелі фіаска. Узарваўся балон апарата Баброва, па лабараторыі разліўся фіксатар, моцна пахла спіртам, не гледзячы на праведзеную прыборку. Я, узгадаўшы пра сваю працу ў абласным аддзеле аховы здароўя, сказаў, што па паху фіксатар мне нагадвае самагон і паведаміў, што ў камандыроўках па раёнах вобласці самым цяжкім для мяне было выпрабаванне самагонам. Ні то што піць, нават на пах яго не пераносіў. А мясцовыя лекары лічылі абавязкам перад чарговым візіцёрам з Мінску паставіць на стол бутэльку. Паколькі на "крамную" не хапала грошай, прапаноўвалі піць самагон. Усе моўчкі слухалі. Шэф запытаў: "А

з чаго робяць самагон?” –“З хлеба”-адказаў я. –“Тады ён павінен быць якасным”- сказаў прафесар. Побач сядзў стомлены працай і няўдачай Андрэй Васільевіч Пішчынскі. Павярнуўшыся да яго, я папрасіў: “Паедзеш у сыботу да бацькоў- раздабудзь бутэльку самаголну, зробім прэзент шэфу”. У панядзелак ён вярнуўся ад бацькоў з бутэлькай. І калі ў другой палове дня ў наш пакой заглянуў шэф, Андрэй паднёс яму бутэльку.

Браць самагон Станча Міленкавіч адмовіўся, што вельмі расчаравала Андрэя. Убачыўшы гэта, шэф на секунду задумаўся, а потым прапанаваў: давайце зараз і паспытаем яго. Я зачыніў на замок дзверы, Андрэй Васільевіч дастаў з тумбачкі стала тры склянкі і разліў самагон. Атрымалася па поўнай склянцы.

–“А закусіць чым?”- схамянуўся я. Мы пачырванелі, паглядаючы адзін на другога. Вось дык прыём наладзілі шэфу! Усё адбылося так нечакана, што мы і не падумалі пра закусь. Бегчы ў краму за каўбасой і хлебам было позна. Андрэй схіліўся, заглядаючы ўглыб тумбачкі стала, але там было пуста. Сёнешнія бутэрброды мы непрадбачліва з’елі. Праўда, ў шуфлядцы майго стала ляжаў суботні ссабойчык, да якога з-за аўрала з фіксацыяй так і не давялося дакрануцца.

– “Вось у мяне захавалася з сыботы”- раскруціўшы паперу, паказаў я. На стол леглі дзве лусты хлеба з вяндлінай. Яна аказалася добра прасоленай і таму не сапсавалася. Праўда, хлеб зачарсвеў. –“Нічога, не турбуйцеся”- бачачы нашу разгубленасць супакоіў Станча Міленкавіч. Узяў нож, парэзаў на невялічкія кавалачкі хлеб і вяндліну. Быццам не заўважаючы нашу разгубленасць пачаў расказваць пра прыёмы, якія яму наладжваў акадэмік Хаджыёлаў у Балгарыі. Сваёй прысутнасцю, паводзінамі, гэтай, па сутнасці падпольнай п’янцы, ён надаў нейкі ўзнёслы характар. Узяў сваю склянку, паглядзеў праз яе у бок вакна, вызначаючы празрыстасць, спакойна панюхаў, узяў крыху вадкасці ў рот, заціх. Мы сачылі за ім, чакаючы, калі ён выплюне гэтую брыдоту і выкажа свой аўтарытэтны прысуд. Балгары ж ведаюць толк у напоях! А Станча Міленкавіч паганяў самагон у роце з

дапамогай губ і шчок, як сапраўдны дэгустатар, а потым, смакуючы, выпіў усю склянку. У мяне нават перахапіла дух, а ён спакойна заключыў: - "Нядрэнны прадукт, і моцнасць не горшая, чым у балгарскай слівовіцы." А потым прачытаў нам цэлую лекцыю пра тое, як у Балгарыі робяць моцную гарэлку са сліў. Наш межсабойчык доўжыўся гадзіны са дзве. Гаварылі аб сваіх праблемах з набыццём рэактываў і посуду, шэф марыў услых, як ён возьме яшчэ аспірантаў і створыць перспектыўны навуковы накірунак – гістафізіялогію эндакрыннай сістэмы эмбрыёна і плада. Шчыры і адкрыты чалавек, ён пачаў распавядаць нам , што заўважыў вельмі цікавыя факты ў гіпаталамусе: там капіляры ляжаць не толькі побач з неўрацытамі, а нават пранізваюць нейрасакраторныя клеткі. Несумненна, такія клеткі нешта выдзяляюць у кроў і, магчыма ажыццяўляюць кіраванне гумаральным шляхам.

–"Мы звяжам у адзіны блок дадзеныя па гіпаталамусу, гіпофізу, наднырачніку, падстраўнікавай залозе. Да гэтага абавязкова трэба дадаць новую інфармацыю па тымусу! Вазьму новага аспіранта і абавязкова даручу вывучаць станаўленне структуры і функцыі тымуса", – выдаваў свае тайныя планы шэф. Аналізуючы гэтыя планы з пазіцый сёнешняга дня, я бачу наколькі моцнай была ў яго навуковая інтуіцыя. Ён не быў у той час такім прызнаным спецыялістам-эндакрынолагам, як прафесары-гістолагі А.А. Вайткевіч і Б.У. Алёшын, але навуковую перспектыву бачыў не горш, а можа нават лепш за іх. Факты, што нервовая, эндакрынная і імунная сістэмы працуюць разам, забяспечваючы працэсы развіцця сёння ўспрымаюцца, як шэраговая ісціна. А ў першай палове шасцідзесятых такая ідэя нават не агучвалася, яшчэ патрэбны былі грунтоўныя доказы гэтага. І да гонару прафесара Мілянкова ён не толькі зразумеў, але і арганізаваў працу ў згаданым накірунку. Адсюль тая апантанасць, з якой ён асабіста пачаў даследваць гіпаталамічныя ядры. З гэтай нагоды ён прыдзірліва шукаў, і не адразу знайшоў аспіранта, які б фундаментальна даследаваў тымус. У

рэшце рэшт выбраў на гэтую ролю А.І. Сыкалу – чалавека добра адукаванага, з бязмежнай творчай фантазіяй, прўда, крыху ленаватага пры выкананні чарнавой працы. На гэтае месца прасілася таксама выпускніца з чырвоным дыпломам, інстытуцкая паэтка Вольга Чарняўская. Мы з Пішчынскім ведалі яе і калі параілі прыняць на кафедру, шэф адразу: -“З мяне хопіць адной выдатніцы! Яны толькі і ўмеюць цяжарнець”. Шэф ніяк не мог прымірыцца з тым, што яго надзея ў плане рэалізацыі новай навуковай ідэі Яўгенія Іванаўна Бальшова ў канцы першага года аспірантуры пайшла ў дэкрэтны водпуск… Прайшоў час. Яўгенія Іванаўна сумела і дачку нарадзіць і бліскуча рэалізаваць даручэнне шэфа. У сваёй дысертацыі, упершыню ў рэспубліцы яна прымяніла колькасныя крытэрыі ацэнкі клетак гангля. Зноў жа, менавіта вучаніца С.М. Мілянкова зрабіла першы крок у колькаснай гісталогіі, сказала гэта новае слова ў беларускай марфалогіі, узняўшы яе на новы ўзровень. І калі сёння з’яўляюцца публікацыі гістарычнага кшталту, мы павінны аддаць належнае чалавеку, які не ўмеў прыгожа гаварыць, але заслужыў права рабіць праграмны даклад на 6-м з’ездзе марфолагаў Савецкага Саюза, які не быў акадэмічна адукаваным біёлагам, але інтуітыўна вызначыў адзін з перспектыўнейшых накірункаў даследванняў на шасцідзесятыя і сямідзесятыя гады. Менавіта ён і яго вучні першымі ў рэспубліцы і саюзе правялі шырокія гістахімічныя даследванні развіцця эндакрынных залоз і тымуса, станаўлення іх функцыі, увялі метад колькаснага аналіза структуры, пачалі эксперыментальныя даследванні магчымасці выкарыстання эндакрынных залоз зародкаў у якасці трансплантацыйнага матэрыялу.

**Здабыткі аспіранта – на карысць усіх**

Аб адкрытасці С.М. Мілянкова ў навуцы мы, аспіранты, ведалі не з чужых словаў, а па ўласнаму вопыту. Ён не рабіў сакрэтаў ні з ідэі, ні з вынікаў даследванняў, што праводзілі супрацоўнікі. Не паспеў я паставіць гістахімічныя рэакцыі на глікаген, нуклеінавыя кіслі, кетастэроіды, як па загаду шэфа мае

прэпараты перагледзелі ўсе супрацоўнікі кафедры, і толькі лянівы не прынёс зрэзы, каб правесці рэакцыі і на яго матэрыяле. Нават Дора Сымонаўна Цвік і Рахіль Міхалаўна Шапіра, якія даўно "навукай" не займаліся, у рэшце рэшт прынеслі зрэзы печані, і я выявіў у іх актыўнасць фасфатаз і эстэраз. Праўда, далей гэтага справа не пайшла, бо апрацаваць увесь імі накоплены матэрыял я не мог, а яны на той час палічылі, што "разменьваць жыццё на навуку ўжо позна". Гэта ж самае адбывалася, калі А.В. Пішчынскі навучыўся дыферанцавана выяўляць розныя клеткі астраўкоў Лангерганса. Я.І.Бальшова правяла гістахімічныя даследванні нервовага гангля, а А.І. Сыкала – тымуса. Уся кафедра ведала, што робіць супрацоўнік, якія вынікі атрымлівае. Гэта спрыяла навуковаму росту кожнага супрацоўніка. Мабыць таму паведамленні нашых маладых навукоўцаў на канферэнцыях и зъездах саюзнага ўзроўня сустракаліся з цікавасцю. Пачатак гэтаму быў пакладзены ў Варонежы, калі я, на той час зялёны і невядомы асістэнт, на падставе атрыманых фактаў пачаў сцвярджаць, што клеткі нервовай прыроды ў надныրачных залозах трапляюць у вены і з токам крыві разносяцца адсюль па арганізму. Паведамленне сустрэлі вельмі ажыўлена і ў значнай ступені недобразычліва. Знакаміты прафесар В.П. Міхайлаў ацаніў паведамленне як экстрапаляцыю, а прафесар Лежава заключыў: "Вы давайце факты, а высновы будзем рабіць мы". Пасля такога раздраю я выйшаў з паседжання з апушчанай галавой. Мабыць не быў гатовы абараняць мяне і Станча Міленкавіч, бо, па-першае, глыбока не займаўся працэсамі эмбрыягенезу і не адчуваў сябе ў абмяркоўваемай праблеме дастаткова трывала, а па-другое, ён не быў майстрам славесных баталій. Мне ж у канцы паседжання слова не далі, як звычайна, з-за цэйтноту. Хутка горыч паразы была перажыта. Гэтаму паспрыяў прафесар А.Г. Кноррэ, які разам з шэфам у перапынку падыйшоў да мяне. Паціснуўшы руку, ён сказаў, што даклад яму спадабаўся, што факты вельмі цікавыя.

– "Не слухайце тых, хто лічыць ідэю фантазёрствам. Вашы дадзеныя сугучны з сучаснымі звесткамі аб міграцыі палавых клетак. У ідэі міграцыі нервовых клетак па судзінах няма нічога крамольнага. Падрыхтуйце артыкул. І мы яго надрукуем". Высокаадукаваны, інтэлігентны, ён зразумеў не толькі ідэю даклада, але і неабходнасць падтрымаць мяне. Гэты стройны чалавек са слыхавым апаратам у вуху, член-карэспандэнт АМН СССР, галоўны рэдактар журнала "Архіў анатоміі, гісталогіі і эмбрыялогіі" Аляксей Георгіевіч Кноррэ назаўсёды застаўся ў маім сэрцы.

**У сямі нянек**

Неяк пад вясну Станча Міленкавіч доўга хадзіў моўчкі, назіраў, як я стаўлю рэакцыю на кетастэроіды, а потым сказаў: –"Я мабыць хутка паеду працаваць у Балгарыю і не змагу кіраваць выкананнем тваёй дысертацыі" Гэтае паведамленне абдало мяне быццам кіпятнем.

–"Дык што мне рабіць?"- знешне спакойна запытаў, пазіраючы на шэфа.

–"Трэба пашукаць другога кіраўніка" – адказаў ён. Бачачы маю заклапочанасць і нават разгубленасць, ён неяк вінавата дадаў: –"Вось і Андрэю Васільевічу я падбіраю другога кіроўца. Ім мабыць будзе член-карэспандэнт АМН СССР, прафесар В.В. Партугалаў. У роспачы нават не спытаў калі плануецца ад'езд. Назаўтра на гэта пытанне шэф адказаў:

– "Мне прапануюць пераехаць на працу ў Балгарыю. Там патрэбны людзі выхаваныя ў савецкім духу, гатовыя быць надзейнай апорай сацыялізма. Балгарскае кіраўніцтва звярнулася да нашага і пытанне разглядаецца ва Урадзе, хутчэй за ўсё прыступлю да выканання новых абавязкаў з першага верасня, пасля летняга водпуску. Наконт кіраўніцтва тваёй працай над дысертацыяй я пагавару з Юрыям Валянцінавічам. Магчыма ён пагадзіцца прыняць на сябе абавязкі кіраўніка". Ю.В. Гулькевіч – знакамітая ў навуковым асяроддзі асоба, паталагаанатам, заядлы паляўнічы і рыбалоў… але ж новы шэф – гэта новыя ідэі і

патрабаванні, а мне гэта не вельмі патрэбна. На той час я ўжо напісаў чарнавы варыянт дысертацыі. Падналёгшы на працу, я праз тры тыдні нечакана для шэфа паклаў яму на стол тэкст дысертацыі. Рэакцыя на гэта спачатку была адмоўнай. Шэф вырашыў, што я падсунуў яму "ліпу" і, карыстаючыся сітуацыяй, хачу атрымаць яго благаславенне на абарону дысертацыі. Пачалася прыдзірлівая праверка маіх прэпаратаў. Не ведаючы гістахіміі ён чапляўся за кожную дробязь. А.В. Пішчынскі, які карыстаўся поўным даверам шэфа, шмат сіл паклаў на тое, каб пераканаць яго, што ўсё напісанае мною адпавядае сапраўднасці. Былі прагледжаны ўсе прэпараты, праверана дакументацыя. Пасля азнаямляльнага этапа пачалася праўка тэкста. Мае журналісцкія звычкі перадаваць змест "вобразна", без паўтораў шэф адсек адразу і рашуча: – "Ёсць каноны напісання дысертацый. Вось іх і прытрымлівайся!" Прышлося перапісаць напісанае. Надыйшло лета, шэф у чарговы раз паехаў у Балгарыю. Пытанне аб яго прызначэнні на пасаду ў Балгарыю, як і прызначэнне мне другога навуковага кіраўніка аставалася адкрытым. Неяк шэф загадаў аднесці Ю.В.Гулькевічу дысертацыю, бо той ёю зацікавіўся, а аформіць яго другім кіраўніком забыўся, ці перадумаў. Дысертацыя праляжала ў Юрыя Валянцінавіча год, а ён усё не знаходзіў часу яе прачытаць. У гэтыж час пад яго кіраўніцтвам дацэнт М.П. Краўцоў пачаў вывучаць гіганцкія клеткі наднырачнікаў, ужо апісаныя ў маёй дысертацыі. Неўзабаве ён абараніў доктарскую дысертацыю, не шмат дабавіўшы ў гэту праблему. У канцы канцоў, пасля вяртання шэфа з Балгарыі дысертацыю ад Ю.В. Гулькевіча мне давялося забраць і абараніць ад адной кафедры, з адным кіраўніком. І Уся гэтая вазня з пераездам шэфа ў Балгарыю і другім кіраўніком аддаліла абарону маёй дысертацыі больш як на год. Па прычыне падвойнага кіравання справа ускладнілася і ў А.В.Пішчынскага. У свой час, плануючы ад'езд у Балгарыю, Станча Міленкавіч дамовіўся з вядомым савецкім гістолагам В.В. Партугалавым, каб ён узяў на сябе кіраўніцтва. Той пагадзіўся. А калі надыйшоў час рэдагаваць тэкст, атрымалася як

у прыказцы пра дзвух нянек: бязвокае дзіця. Партугалаў, чалавек не вельмі далікатны пачаў рашуча вытраўляць з тэксту "беларусізмы". Чарговае вяртанне главы з Масквы пасля рэдагавання моцна псавала настрой і дысертанту і Станчу Міленкавічу. Некалькі дзён Андрэй Васільевіч хадзіў сумны і пахмурны, шэф часцей звычайнага паўтараў: –"Фу ты чорт, які грубіян!" Але ні ён, ні Андрэй нікому пра гэта не казалі

Пасля некалькіх "сеансаў" мой сябра не вытрымаў і паказаў мне тое, што выпраўляў Партугалаў. Прагледзеўшы гэтыя опусы, я зразумеў сам і пераканаў Андрэя, што без гумару тут не абыйсціся. Мы пачалі разам, уголас абмяркоўваць заўвагі, што В.В.П. пакінуў на палёх чарнавіка. Усё б нічога, беларусы умеюць сцярпець і не такое, паважаючы імідж і статус грубіяна, але перапіска вельмі доўжылася і адцягвала час абароны дысертацыі, а значыць і паляпшэння матэрыяльнага стану дысертанта. Як тут не згадаць словы Я. Коласа: "О, каб сабраць каменні тыя, што губяць усходы маладыя! "

**Не навукай адзінай**

Дзякуючы цесным адносінам Станчы Міленкавіча з прафесарам С.І. Шчалкуновым мы, супрацоўнікі кафедры гісталогіі МДМІ доўгі час былі пастаяннымі ўдзельнікамі навуковых канферэнцый, якія часта ладзіліся ў Ваенна-Медыцынскай Акадэміі . Нас там добра сустракалі. Акрамя таго, мы, моладзь ўзімку імкнуліся пабываць у цудоўных музеях Ленінграда, а ўлетку – наведаць прыгарады Паўночнай Сталіцы. Шчыра кажучы, Станча Міленкавіч спачатку крывіўся, што мы марнуем на гэта шмат часу, але пасля таго, як прафесар М.І. Зазыбін, якому ён паскардзіўся, падтрымаў не яго, а нас, шэф пачаў часам далучацца да нашай кампаніі. Засталіся ў памяці паходы ў Марыінку, Рускі музей, паездкі ў Пецергоф. Некаторыя ваяжы я нават адсняў на вузкую кінаплёнку і неяк "пракручваў" на кафедры. Тут мы лепш пазнавалі шэфа як чалавека: простага жыццялюба, непатрабавальнага да камфорту і ежы. Глядзелі на яго і пагаджаліся

са славутым Мішэлем Ментэнем, што характэрная прыкмета мудрасці – гэта нязменна радаснае ўспрыйманне жыцця.

**Педагагічныя варункі**

Аспірантам, як вядома, давяраюць праводзіць практычныя заняткі ў адной групе на другім годзе навучання. С.М. Мілянкоў дазваляў гэта толькі на трэцім годзе навучання і пад яго няўсыпным кантролем. Ён добра ведаў гісталогію і з зайздроснай лёгкасцю мог перадаць ідэю структуры ў простай, зразумелай схеме. Думаю, што не перабольшу, калі скажу, што пры С.М. Мілянкове альбомы нашых студэнтаў былі лепшымі ў Савецкім Саюзе. На жаль, па розных прычынах, мы страцілі гэты ўзровень. Па-першае, рэзка павялічыўся аб'ём інфармацыі, якую неабходна засвоіць за кароткі адрэзак часу; па – другое, дзякуючы Мінскім гістолагам створан такі незаменны вучэбны дапаможнік, як практыкум, які фармалізаваў і спрасціў выкананне замалёўкі; па – трэцяе, яе замяніла фатаграфаванне прэпарата з дапамогай сучаснай лічбавай апаратуры і г.д. Але застаецца факт, што сёння пасля сканчэння занятка па тэме ў альбоме не знойдзеш ніводнага малюнка, які б задаволіў Станчу Міленкавіча. Ён сам добра маляваў і патрабаваў ад падначаленых таго ж. Шмат гадзін правялі мы, яго аспіранты і маладыя асістэнты замалёўваючы прэпараты пад яго наглядам. Ён нават меркаваў стварыць галерэю малюнкаў, выкананых аспірантамі. Працу ў гэтым напрамку нават пачынала дацэнт Бальшова, паколькі валодае талентам мастачкі. Калі мы, выкладчыкі, спрабавалі вінаваціць студэнтаў за недастаткова глыбокія веды шэф спакойна зазначаў: – "Трэба лепш вучыць, і, галоўным чынам, не наказам, а паказам". Ён умеў гэта рабіць. Пачынаючы з трэцяга года навучання мяне падключылі да педагагічнага працэса, якім і займаюся бесперапынна больш шасцідзесяці гадоў. На занятках шмат увагі надавалася вывучэнню прэпаратаў і іх замалёўцы. Гэтая частка працы была пастаўлена на належную вышыню. Загадчык кафедры асабіста займаўся з аспірантамі і маладымі асістэнтамі, адпрацоўваючы

тэхніку замалёўкі, напрыклад, нырак, касы, лёгкіх, іншых органаў напярэдадні іх вывучэння студэнтамі. На гэта траціліся многія гадзіны, але мы, моладзь, хутка адчулі, што можам нечаму навучыць студэнтаў не горш за ветэранаў. З боку старэйшых калег гэта ўспрыймалася неадназначна. Але нават тыя, хто пакінуў надзею напісаць дысертацыю, як Р.М. Шапіра і Д.С. Цвік, у размове аб апантанасці шэфа педпрацэсам давяральна адзначалі: “З прыходам на кафедру Мілянкова мы самі па сапраўднаму вывучылі прэпараты”. На кафедры існавала непарушнае правіла: маладыя выкладчыкі павінны был хадзіць на лекцыі шэфа. Гэта была добрая школа – як трэба вучыць. Многія дэталі сцерліся з памяці, але яскрава помніцца як проста, даходліва, знешне прымітыўна можна расказаць пра будову органа, перадаць ідэю на схеме (якую шэф заўсёды маляваў экспромтам). На яго лекцыі не заўважалася ні літаратурная недасканаласць мовы, ні абмежаванасць лексікі. Яны адыходзілі на другі план. Студэнты на дзіва добра засвойвалі асновы лекцыйнага матьэрыялу. Многае з таго, што і як даносіў Станча Міленкавіч да студэнтаў я і сёння выкарыстоўваю ў сваіх лекцыях і са здзіўленнем бачу, што менавіта гэтыя моманты лепш застаюцца ў памяці слухачоў. Гэта, мабыць, і ёсць адна з прыкмет высокага майстэрства выкладчыка.

Не гледзячы на невысокую базавую падрыхтоўку Станча Міленкавіч умеў вучыцца. Я не ведаю ніводнага больш-менш знакамітага гістолага ў якога ён не бываў на лекцыях. У кожны свой прыезд у Маскву, Ленінград, або Кіеў ён абавязкова да каго небудзь хадзіў паслухаць, як яны чытаюць тую, ці іншую лекцыю. Памятую, з якім захапленнем ён расказваў пра лекцыі прафесара Л.І. Фаліна па развіццю твару і зубоў, або лекцыі А.Г. Кноррэ па эмбрыягенэзу, ці В.Г.Елісеева па рыхлай злучальнай тканцы. Менавіта тэкст фалінскай лекцыі ён раздрукаваў і прэзентаваў кожнаму, хто збіраўся чытаць лекцыі на нашай кафедры. У той час гэта ўспрымалася, як належнае. Ён прывучыў нас, што горкая праўда ў справаздачы лепш за салодкі падман, што галоўнае правесці гутаркі, паседжанні,

даследванні, словам, зрабіць справу, а не напісаць рапарт, раздуць з мухі слана, а потым таргаваць слановай косцю. Не ведаю, можа такі гэта быў час, але хутчэй такі гэта быў "несучасны" чалавек.

І яшчэ. Напаўняючы памяць студэнта, ён заўсёды клапаціўся пра іх розум і сумленне. Мабыць з сёнешніх пазіцый шмат у чым Станча Міленкавіч выглядае дзіваком, ці, як кажуць, белай варонай. Ён вельмі перажываў, што кафедра дрэнна абсталявана. І калі пачалася інтэнсіўная навуковая праца, аказалася, што колькасць прэпаратаў хутка павялічваецца, а захоўваць іх няма дзе. Шэф нядобрымі словамі памінаў рэктарат і час ад часу звяртаўся па дапамогу да Сенькі з Пецькам (былі ў інстытуце два цесляры, любіцелі апоўдні прыняць па келішку), каб яны нарабілі скрынак для захоўвання прэпаратаў, але гэта не вырашала праблему. Уздыхаючы, ён расказваў, якія цудоўныя шафы і скрынкі для прэпаратаў бачыў у Балгарыі. Адну скрынку яму нават далі ў якасці прэзента…

Я вырашыў дапамагчы шэфу. У той час на другім курсе вучылася дачка галоўнага ўрача Барысаўскай гарадской бальніцы Б.В. Мардвінава з якім я быў знаёмы па працы да аспірантуры. Папрасіў яго аб дапамозе, намякаючы, што хутка сесія і не пашкодзіць пазнаёміцца з загадчыкам кафедры. Той зайшоў на кафедру і шэф паказаў галоўнаму ўрачу свой балгарскі прэзэнт. Праз тыдзень Мардвінаў прывёз чатыры прыгожыя скрыначкі для прэпаратаў, зробленыя ў выглядзе пеналаў на барысаўскай фабрыцы піяніна. Выраб спадабаўся. Шэф пачаў націскаць, каб такіх скрыначак зрабілі сотні са дзве. Госць, заплаціўшы за гэтыя сваімі грашыма, адмовіўся, даводзячы, што фабрыка гэтым не займаецца, а мне паясніў, што гэтыя чатыры зрабіў майстар, якога ён аперыраваў, па яго асабістай просьбе . Але што не зробіш дзеля любімай дачкі, маці якой памерла і якую ён гадуе адзін… Мардвінаў пайшоў да дырэктара інстытута, А.А. Ключарова, афармілі заказ і навязалі фабрыцы не толькі на скрыначкі, але і на спецыяльныя шафы для прэпаратаў за мінімальную аплату з боку інстытута. Кафедра атрымала тое, што

прасіла, шэф задаволена паціраў рукі … Аднак, калі я напомніў , што на іспыты да яго прыдзе дачка Мардвінава, шэф адказаў: – “Ніякіх паблажак! Гэта справа дзяржаўная”, а потым дадаў: – “Я экзаменаваць яе не буду, няхай гэта зробіць Ленэрг Восіпавіч”. Для мяне гэта была непрыемная нечаканасць, бо ўсе ведалі, што сабою ўяўляе Красоўскі як экзаменатар. Добра што студэнтка старанна вучылася, а ў дадатак мы з Пішчынскім папрацавалі рэпетытарамі. Іспыты яна здала на “пяць”. Улічваючы, што ў той час за сесію мы выстаўлялі каля сотні двоек і што пяцёрку паставіў Ленэрг Восіпавіч, гэта быў поспех.

**Каго лічыць вучнямі**

Станча Міленкавіч шмат часу траціў на кіраванне студэнцкім гуртком. Рабіў ён гэта асабіста, або даючы даручэнні аспіранту. У гуртка не было вялікіх поспехаў, а ў колькасным плане назіраліся моцныя “прылівы” перад іспытамі. Шэф любіў кансультаваць студэнтаў, выведваючы слабіну ў іх падрыхтоўцы. Звычайна колькасць слухачоў не ўмяшчалася ў аўдыторыі, і ён развешваў гісталагічныя плакаты і табліцы ў прасторным калідоры па ўсяму другому паверху анатамічнага корпуса. А потым, па два разы ў дзень, як сапраўдны экскурсавод вадзіў студэнтаў па ўсёй галерэі. Звычайна кансультацыя доўжылася гадзіны 2-2,5 і завяршалася рэгістрацыяй новых членаў гуртка ў тоўстым сшытку. Уступалі цэлымі групамі. Праўда, пасля іспытаў з іх толькі адзінкі наведвалі паседжанні гуртка. Тым не меньш не многія загадчыкі кафедраў у той час, ды і сёння, мелі і маюць такі ўраджай на таленавітых вучняў, як прафесар С.М. Мілянкоў. Сам нястомны працаўнік, адкрыты да людзей настаўнік, ён спрыяў навуковаму і прафесійнаму росту большасці з тых, хто з ім сутыкаўся. Сярод тых, хто лічыў, ці лічыць сябе яго вучнямі акадэмікі К.А.Зуфараў і Д.Х.Хамідаў, прафесары Рахматулін, Хабарава, В.Т. Камінская, А.А. Арцішэўскі, Э.І. Вальковіч. Апошні пачаў сваю навуковую кар’еру ў студэнцкім гуртку нашай кафедры, а потым узначаліў кафедру гісталогіі ў Педыятрычным Інстытуце Санкт-Пецярбурга. Вучнямі яго з’яўляюцца

кандыдаты навук Л.І. Красоўскі, Л.П.Кніга, В. Адзінцоў, А.В. Пішчынскі, Я.І. Бальшова, Л.Р.Крывадубская, В.А. Ляцецкі, Н. Адзінцова, А.І. Сыкала і многія іншыя. Па розных прычынах не ў кожнага з пералічаных і іншых людзей у рэфератах напісана прозвішча С.М. Мілянкова. Галоўная сярод іх – яго абыякавасць да стварэння культу асобы кіраўніка. Ён вельмі неахвотна даваў згоду быць сааўтарам артыкулаў, якія правіў і даводзіў да кандыцыі, ніколі не патрабаваў запісваць яго кіраўніком па дысертацыі, аказваючы дысертанту дапамогу. І калі сёння недасведчаны чалавек прарэвізуе архівы, то будзе канстатаваць, што ў С.М. Мілянкова амаль няма вучняў. З гэтым нельга пагадзіцца. Менавіта таму хачу засведчыць, што кожны з пералічаных мною гістолагаў, і шмат іншых, у размовах са мною лічылі ці лічаць сябе вучнямі Станчы Міленкавіча. Аб гэтым казаў мне і П.В. Дунаеў – той час перспектыўны гістолаг з Цюмені, якому С.М. Мілянкоў дапамагаў па доктарскай дысертацыі, і вырашыў узяць на кафедру ў якасці дацэнта. У 1985 годзе прыйшоў да мяне ў асістэнцкую чарнявы невысокі мужчына і сказаў, што хоча пагаварыць сам на сам. Мы выйшлі з анатамічнага корпуса, дзе ў той час размяшчалася кафедра, і накіраваліся на стадыён “Дынама”. Павел Васільевіч паведаў мне, што прыязджаў да Мілянкова па справах дысертацыі і Станча Міленкавіч прапанаваў яму пераехаць у Мінск, каб у перспектыве ўзначаліць кафедру гісталогіі. Тым больш , што ў нас супадаюць накірункі навуковых даследванняў.

– “Чаму вы расказваеце мне пра гэта?”- спытаў я.

– “Я ведаю, што вы перспектыўны супрацоўнік кафедры и хачу каб мы пасябравалі. Абяцаю, што ніколі не буду перашкаджаць вашаму росту”.

– “Дзякую”

– “Мая жонка, як і ваша, тэрапеўт, працуе галоўным тэрапеўтам вобласці. Мяркую, гэта таксама паспрыяе нашаму ўзаемапаразуменню”. На гэтым нашая размова скончылася. Аб ёй ад мяне даведаліся А.В. Пішчынскі і Л.І. Красоўскі. Імі

навіна была ўспрынята адмоўна. Прыкладна праз тыдзень, пасля наведвання міністра, шэф, нейк разгублены і расчараваны, некалькі разоў заглядваў у практыкум, дзе я праводзў заняткі, а потым паклікаў да сябе ў кабінет і паведаміў, што міністр забараніў прымаць на працу П.В. Дунаева і прапанаваў вырошчваць сваіх супрацоўнікаў. Не ведаю, як успрыняў гэта П.В. Дунаеў, а шэф нейкі час паўтараў сваё звычнае: – “Фу ты чорт!” Потым супакоіўся і загаварыў: – “Я хацеў бы перадаць кафедру Андрэю. Ён прыроджаны гістолаг, але вельмі хворы, у яго не хопіць здароўя. І Ленэрг нічога зрабіць не здолее, застанецца дацэнтам. Трэба расці табе”.

Былі прыклады і іншага кшталту. Не сышліся характарамі з Мілянковым будучы прафесар М.П. Краўцоў, які пакінуў кафедру і стаў доктарам медыцынскіх навук пад кіраўніцтвам Ю.В. Гулькевіча, а яго вучань В.І. Нізаўцоў пайшоў працаваць на кафедру судзебнай медыцыны.

Нельга назваць цёплымі і творчымі адносіны паміж шэфам і асістэнтам Н.А. Жарыкавай. Ніна Аляксандраўна прыйшла на кафедру ўжо сфарміраваным чалавекам і спецыялістам. Адукаваная, інтэлігентная, ужо папрацаваўшая загадчыцай кафедры ў Віцебску, стройная прыгажуня з вялікім навуковым патэнцыялам, Ніна Аляксандраўна не прыняла дробязнай апекі і павучанняў Мілянкова. Тут, як кажуць, найшла каса на камень. Чым больш ён націскаў на непакорную асістэнтку, плануючы падпарадкаваць сабе і перавучыць на свой лад, тым больш вострымі былі яе рэплікі і пярэчанні ў бок шэфа. На жаль, адносіны паміж гэтымі працавітымі людзьмі з вялізным запасам энергіі так і не наладзіліся. Мяркую, ад гэтага страцілі і яны абодва, і агульная справа.

**Апошнія сустрэчы**

Пасля абароны кандыдацкай дысертацыі на нейкі час я пераключыўся на педагагічны працэс, амаль зусім закінуўшы навуку. Здавалася, што гэта адпавядала і планам шэфа. Але адмова міністра прыняць на кафедру П.В. Дунаева, пагаршэнне

адносін з рэктарам і мінздравам з-за ”аспіранцкіх баталій”, наканец, прыезд у Мінск з Чарнавіц гістолага прафесара К.П. Рабава, якога Станча Міленкавіч успрыняў, як патэнцыйнага канкурэнта, зрабілі сваю справу. Шэфа як бы падмянілі. Бачачы, што ў нас з Пішчынскім атрымліваюцца абнадзейваючыя вынікі па трансплантацыі плодных эндакрынных залоз, ён разам з прафесарам Ц. Е. Гніларыбавым – галоўным хірургам рэспублікі і прызнаным у СССР трансплантолагам прапанавалі планаваць доктарскую, абяцаючы ўсялякую падтрымку. Андрэй, спасылаючыся на слабое здароўе, рабіць гэта адмовіўся, але дапамог ім угаварыць мяне. Заканчэнне працы планавалася праз два гады. Шмат часу займалі эксперыменты па перасадцы, кансервацыі матэрыялу, паколькі ні посуду, ні спецыяльнай апаратуры не было, ды і вопыту таксама.

Прыходзілася прыдумваць абходныя шляхі. Пэўныя цяжкасці былі і з фіксацыяй, заліўкай матэрыялу для ферментахіміі і электроннай мікраскапіі. Амаль кожны дзень да 24 гадзін працавалі побач са мною А.В. Пішчынскі і шэф. Андрэй, як і абяцаў, часта дапамагаў мне, шэф – на “сваім полі”. Ён як бы бег з намі напераганкі, бо натрапіў на незвычайныя рэчы ў клетках ядраў пярэдняга і сярэдняга гіпаталамуса і разгарнуў шырокі фронт па іх вывучэнні. Уся лабараторыя і асабіста старшы лабарант Л.Р. Крывадубская “даводзілі да розуму” новы метад афарбоўкі, распрацаваны шэфам. За гэты метад Станча Міленкавіч атрымаў аўтарскае пасведчанне і цяпер яго надта шырока выкарыстоўваў пры вывучэнні працэсаў нейрасакрэцыі і эндакрыніі.

На кафедры актыўна працавала моладзь, абазначыліся ўяўныя поспехі ў яго асабістых даследваннях, станавілася больш выразнай ідэя аб адзінстве нервовай, эндакрыннай і імуннай рэгуляцыі, а шэф час ад часу выказваў незадаволенасць.

– “Марудна, трэба хутчэй, застаецца мала часу!” - слухаючы мае справаздачы падганяў ён. Асілак у параўнанні з намі, чалавек, які мог адзін падняць і перанесці масіўны лабараторны стол, пачынаў упадаць у нейкую дэпрэсію і скардзіцца на

здароўе. Пярэчанні, што ён здаровы і пераживе нас цяпер злавалі і крыўдзілі яго. Галоўнай бядой і прычынай страху было тое, што кафедру можа заняць "прахадзімец Рабаў", або чужак, які загубіць узрошчаныя ім парасткі. Стваралася ўражанне, што ён бачыць нешта, недаступнае нам, паводзіць сябе так, быццам за ім нехта гоніцца.

Прыкладна ў палове дня ў суботу, калі мы з Пішчынскім абмяркоўвалі, як хутчэй закончыць кафедральныя справы і прыступіць да выканання хатніх абавязкаў, у дацэнтскую зайшла старшы лабарант Г. М. Шчыгель і перадала просьбу шэфа зайсці да яго ў кабінет. Шэф сядзеў за рабочым сталом. Загадаў сесці на канапу, што стаяла насупраць стала, памаўчаў, потым паведаміў, што сціскае сэрца.

– "У панядзелак будзеш чытаць лекцыю замест мяне". Я паспрабаваў спіхнуць яе на Красоўскага, аргументуючы тым, што заняты праблемай трансплантацый і гэтую тэму ніколі не чытаў… Але ён рэзка мяне перапыніў, трымаючы далонь правай рукі на вобласці сэрца.

– "Дазвольце выклікаць хуткую дапамогу"– падыходзячы да тэлефона прапанаваў я.

– "Ні ў якім разе!"– рэзка запярэчыў шэф. Дастаў белага колеру таблетку і паклаў пад язык, расслабіўся, потым прадоўжыў: – "Ужо адпусціла". Нехта прыадкрыў дзверы, спрабуючы ўвайсці у кабінет.

– "Зачыніце дзверы, не мяшайце пагаварыць з чалавекам!"– рэзка і громка выпаліў ён. Відаць не хацеў, каб нехта даведаўся аб яго нездароўі. Дзвеы зачыніліся. Ніхто больш нас не турбаваў. Маю прапанову выклікаць скорую зноў праігнараваў, але з кабінета мяне не адпускаў, быццам баяўся застацца адзін. Прыкладна праз гадзіну, калі наблізіўся час абеду, я угаварыў яго пайсці ў лечкамісію, дзе ён быў на ўліку. З кафедры на Чырвонаармейскую вуліцу мы пайшлі павольным крокам, але пешшу. Ехаць тралейбусам ён не захацеў, а выклікаць таксі забараніў:-"Убачаць

што не магу хадзіць і адправяць на пенсію”- быў яго аргумент. У лечкамісіі знялі кардыяграму, кардыёлаг яе расшыфраваў і супакоіў, што нічога сур’ёзнага ў сэрцы няма. Шэф павесялеў, нават уз’юшыўся. Паколькі гэта была субота і я спазняўся з працы, а на мне віселі гаспадарчыя абавязкі, я з лечкамісіі патэлефанаваў дахаты і расказаў пра нашу эпапею. Пачуўшы пра гэта, тры вопытныя тэрапеўты нашай сям’і параілі Станчы Міленкавічу застацца ў лечкамісіі і назаўтра паўтарыць кардыяграму… Але ён больш нікога не жадаў слухаць. Нават прапанаваў не суправаджаць яго з лечкамісіі. Я моўчкі праводзіў яго дадому. Мы развіталіся і разыйшліся. Ноччу Мілянкова Станчы Міленкавіча не стала.

Працавіты чалавек, сціплы савецкі прафесар не нажыў за сваё жыццё ні дачы, ні машыны, ні ашчаднай кніжкі. Не простыя выпрабаванні выпалі і на долю кафедры. Прыйшоў новы кіраўнік, які не ўпісаўся ў створаную Міленковым працоўна-творчую і чалавечую атмасферу. Памылкі дапусціў і рэктарат з парткомам, валявым шляхам навязваючы на пасаду шэфа не надта чыстапплотнага чалавека. Кафедральны бунт быў выкарыстан яўна не лепшым чынам.

Потым загадваць кафедрай прызначылі дацэнта-анатама Леанцюка А.С. У навуковых працах ён зрабіў акцэнт на колькасных крытэрыях ацэнкі вывучаемай структуры. Колькасная марфалогія, як і астатнія галіны навукі, ужо набірала хуткія абароты ў прыбалтаў і масквічоў, з якімі мы супрацоўнічалі, і Яўгенія Іванаўна Бальшова ў 1971г. абараніла дысертацыю выкарыстаўшы колькасныя паказчыкі стадыйных і ўзроставых змен пры развіцці сімпатычных гангляў. На маю думку, кафедра ў значнай ступені страціла сваю “гісталагічную сутнасць”, свой высокі навуковы ўзровень. Нават праз пяцьдзесят гадоў яна не мае добрай сучаснай лабараторыі, здольнай забяспечыць правядзенне даследванняў на сёнешнім узроўні. Я мяркую, што сёння няма патрэбы завучваць шэфавы настаўленні, але вельмі карысна пранікнуцца духам яго апантанага служэння справе.